# ПЛАН-КАНСПЕКТ УРОКА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў Х КЛАСЕ ПА ТЭМЕ «ВОБРАЗ АНДРЭЯ ЛАБАНОВІЧА – БЕЛАРУСКАГА ІНТЭЛІГЕНТА, ШУКАЛЬНІКА ІСЦІНЫ, СЭНСУ ЖЫЦЦЯ»[1]

*Маліноўская Валянціна Мікалаеўна*

**Мэта:** мяркуецца, што напрыканцы ўрока вучні *будуць ведаць* асаблівасці вобраза Андрэя Лабановіча; авалодаюць паняццем выяўленне аўтарскай пазіцыі ў празаічным творы; удасканальваць *навыкі* запаўнення апорнай табліцы, кластара, работы з тэкстам мастацкага твора.

**Задачы выхавання і развіцця:** стварыць умовы для фарміравання пазітыўнага стаўлення вучняў да жыцця; развіваць інтэлектуальныя здольнасці, аналітычнае мысленне; удасканальваць камунікатыўныя навыкі; выхоўваць цікавасць да беларускай літаратуры.

**Абсталяванне:** выстава карцін Я. Кругер "Якуб Колас", А. Шаўчэнка "Перад дарогай", Л. Асецкі "Перад дарогай", В. Шаранговіч "У люсінскай школе", В. Жолтак "У люсінскай школе", У. Раманоўскі "Школа ў Смалярні", П. Калінін "У палескай глушы".

*Настаўнік – соль зямлі*
Сымон Будны

**Ход урока**

**I. Арыентацыйна-матывацыйны этап.**

*Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.*

Слова настаўніка.

У беларускай літаратуры няшмат твораў, дзе галоўным героем з'яўляецца настаўнік. Давайце нагадаем іх – гэта "Сірочы хлеб" Янкі Брыля, "Абеліск" Васіля Быкава, "Настаўнік чарчэння" Івана Навуменкі.

Яшчэ ў далёкім XVI стагоддзі Сымон Будны сцвярджаў: "Настаўнік – соль зямлі". Нямецкі філосаф Іммануіл Кант, звяртаючыся да педагога, заклікаў: "Вучыце сваіх дзяцей не завучваць думкі, а думаць". Гэтаму вучыў сваіх вучняў Андрэй Лабановіч. Галоўны герой твора – малады вясковы настаўнік Андрэй Лабановіч – вобраз выразна аўтабіяграфічны. Якуб Колас прызнаваўся: «Лабановіч – мой двайнік. Выдуманага ў яго паводзінах і характары нічога няма».

**Праца з прэзентацыяй.** *(Вучням прапануецца прэзентацыя, якая адлюстроўвае вобраз настаўніка пачатку XX ст.)*

**Гутарка.**

1. Ці можна па першым слайдзе здагадацца, якая назва аб'ядноўвае гэтыя два палатны?
2. Да якога эпізоду з твора можна аднесці другі слайд?
3. Якая "вечная" прафесія адлюстравана на гэтым слайдзе?
4. Што засталося нязменным у выхаванні дзяцей да сённяшняга дня?
5. Ці можна лічыць твор актуальным сёння? Што збліжае вас, сённяшніх вучняў, з героямі трылогіі?" (**Ключавое праблемнае пытанне.** Настаўнік слухае, прымае першапачатковыя меркаванні вучняў і пакідае пытанне адкрытым).

**II. Мэтавызначэнне.**

**Слова настаўніка.**

Звярніце ўвагу на тэму ўрока (запісана на дошцы), прачытайце яе. Пра што сёння пойдзе гаворка на ўроку? Давайце разам паспрабуем вызначыць мэты ўрока. (Настаўнік выслухоўвае прапановы і разам з вучнямі фармулюе мэты ўрока).

– Запішыце ў сшытак найбольш складаную мэту ўрока для вас.

**III. Аперацыйна-пазнавальны этап.**

Перадайце змест аповесці, абапіраючыся на асацыятыўную карту. Кожная з груп мае права перарабляць, дапрацоўваць, змяняць, маляваць свае асацыяцыі, звязаныя з героямі і сюжэтам.

*(Прыкладная асацыятыўная карта)*

**1 група.**
I. Размова з бабкай Мар'яй пра сэнс чалавечага жыцця.
II. Думкі Лабановіча.
III. Выезд з вёскі, размова з дзядзькам Сцяпанам.
IV. Знаёмства з настаўнікам Саханюком.
V. Хатовіцкая "інтэлігенцыя".
VI. Знаёмства з айцом Кірылам.
VII.Першае знаёмства са сваімі вучнямі.
VIII Праца ў школе, знаёмства з сем'ямі дзяцей.
IX. Пан падлоўчы са сваёй сям'ёй.
X. Свята ўводзін Прасвятой Багародзіцы.
XI. Работа ў школе наладжваецца.
XII. У гасцях старасты Бабініча.

**2 група.**
XIII. Размова з бабкай Мар'яй.
XIV. Сустрэча з настаўнікам Турсевічам.
XV. Гутарка сяброў.
XVI. Гонар за беларусаў.
XVII. Гаворка з паннай Ядвісяй.
XVIII. Размова з бабкай Мар'яй пра Ядвісю.
XIX.Прыезд Саханюка да Лабановіча.
XX.Размова Лабановіча з Ядвісяй і Габрынькай.
XXI. Шмат перажыў, перадумаў малады настаўнік.
XXII.Размова з пані падлоўчай (2 жонкай падлоўчага).
XXIII. Трэба рухацца. Дарога трудная…
XXIV. Прыгажосць кравідаў.

**3 група.**
XXV. Думкі пра Ядвісю.
XXVI. Размова з айцом Кірылам.
XXVII. Размова з паннай Людмілай.
XXVIII. Размова з Ядвісяй.
XXIX. Размова Ядвісі збабкай Мар'яй.
XXX. "Вы – мая госця нявольніца".
XXXI. Вербніца і Благавешчанне.
XXXII. Размова ў хаце пана падлоўчага.
XXXIII. Пакет з дакументамі. Кватэра пана Грынько.
XXXIV. Экзамены. Прыезд інспектара.
XXXV. Апошні вечар Ядвісі.
XXXVI. Ціхая ноч на Палессі.




Перадайце змест аповесці, абапіраючыся на асацыятыўную карту. Кожная з груп можа перарабляць, дапрацоўваць, змяняць, маляваць свае асацыяцыі, звязаныя з героямі і сюжэтам.

**Гутарка па пытаннях** *(адказы на пытанні падмацоўваюцца цытатамі з твора).*

[1] Якуб Колас. Трылогія «На ростанях»,частка першая «У палескай глушы».

1. Хто з'яўляецца галоўным героем трылогіі? *Абгрунтуйце свой адказ. (Цэнтральны герой трылогіі – малады настаўнік А. Лабановіч. Яго вачыма пададзены партрэты ўсіх персанажаў. Лабановіч любіць людзей, ставіцца з вялікай цікавасцю да іх лёсаў: будзь гэта святар, калега-настаўнік або інспектар, пісар або селянін-паляшук. Лабановіч з увагай дапытліва будзе вывучаць кожнага з іх).*

2. Ці ёсць апісанне партрэта Лабановіча ў творы? З чаго яно складаецца? *(Бачыцца за ходам думак героя, яго ўчынкамі, паводзінамі, ацэнкамі іншых людзей, за яго манерай гаварыць з людзьмі іншых сацыяльных пластоў і г.д. Якуб Колас вылучае дабрыню і інтэлект, няспыннае біццё імклівай і аналітычнай думкі ў яго вачах).*

3. Як апісвае свайго героя Якуб Колас? (Паказальна, што апісанню знешнасці свайго героя Якуб Колас адводзіць зусім нязначнае месца. З розных месцаў трылогіі можна сабраць скупыя такія дэталі, як *"цёмныя вочы, у якіх часта адбівалася нейкая затоеная думка", "цёмныя, маладыя вусікі", "смешны ён, калі падымае свае вочы, такія добрыя і ўдумныя, і пазірае ў акно".* Малюючы Лабановіча, Якуб Колас не падаваў апісання адзення).

4. Якога ўзросту герой трылогіі? *(Малады чалавек, гадоў за дваццаць. Ён шукае свой шлях у жыцці, шмат у чым няўпэўнены, сумняваецца. )*

5. Як паказана развіццё характару Лабановіча? *(Андрэй Лабановіч – аналітык, чалавек актыўнага разумовага складу мыслення. У першай частцы ён усіх і ўсё падвяргае глыбокаму аналізу, шмат увагі надае і самааналізу. Невыпадкова адным з педагагічных прыёмаў было развіваць у сваіх выхаванцаў крытычны розум, каб да кожнай з'явы і факта яны падыходзілі з пытаннем: "У чым іх прычыны?")*

6. "Для чаго чалавек жыве на зямлі?" – пытанне, з якім Андрэй Лабановіч звяртаецца то да аднаго, то да другога. Як характарызуецца той чалавек, якому рупіць знайсці адказ на такое пытанне?

| | | |
|---|---|---|
| Бабка ар'я | "... жыве, покі жывецца, бо жывы ў зямлю не палезеш, а прыйдзе смерць, тады пахаваюць". " Жыве чалавекі жыве, пакуль Бог яму прызначае". | Большасць людзей не задумваюцца над праблемай пра сэнс чалавечага жыцця, а калі задумваюцца, то знайсці адказ не так проста і лёгка |
| Турсевіч | "Жыве чалавек дзеля дабра, для служэння праўдзе, каб стварыць нейкія вартасці жыцця і каб быць карысным для іншых". | Традыцыйны падыход, адчувалася яго адукаванасць |
| Саханюк (хатовіцкі настаўнік) | | Матэрыяльны дабрабыт |

**Праца з табліцай.**

**Заданне па групах.** Ахарактарызуйце вобразы настаўнікаў Андрэя Лабановіча, Турсевіча, Саханюка ў адпаведнасці з крытэрыямі, вызначаанымі ў кластары.

**Праца з кластарам.**




*Прыкладныя адказы вучняў*

**1 група – вобраз Андрэя Лабановіча.**

Лабановічу характэрны дух вандроўніцтва. Ён выразна ўсведамляе сваю нацыянальную прыналежнасць. Вызначаецца шырынёй і разнастайнасцю інтарэсаў. Не валодае выключнай фізічнай сілаю. З адказнасцю ставіцца да прафесійных абавязкаў. Усведамляе свае памылкі, самакрытычны. Выпрабоўвае сваю волю і характар. Баіцца закрыць сабе дарогу да заветнай мэты – "на шырокі прастор". Вызначаецца добрым літаратурным густам. Любіць прыроду, чуйны да яе хараства. Па душы яму быў куток Палесся. Любуецца хараством жанчын, здольны кахаць. Грамадскі дзеяч і рэвалюцыянер.любіў пагаварыць з бабкай Мар'яй, з рознымі людзьмі паводзіў сябе па-рознаму. Адказны, шмат часу адводзіў на самападрытоўку, быў патрабавальны да сябе і дзяцей, аддаваў усяго сябе школе. Свае пачуцці не выстаўляе напаказ. Адно слова "дзяўчына" выклікала ў яго душы чысты вобраз, нават у думках не дазваляе сабе зняважыць дзяўчыну. На яе можна пазіраць і любавацца толькі здалёк.

**2 група – вобраз Турсевіча.**

Турсевіч – настаўнік Лабановіча, "дарэктар" і зямляк. Турсевіч пачынаў працу ў Цельшыне, адносіўся да працы адказна. У доме падлоўчага з павагай гаварылі па Турсевіча як настаўніка і асобу. Зараз ён працуе на Случынне. Лабановіч паважаў Турсевіча, які жыў па формуле – жыць для дабра. Яго ўчынкамі кіруе клопат не пра іншых, а пра сябе. Настаўнікаў аб'ядноўвае высокая адказнасць да працы, глыбокая начытанасць. Турсевіч надаваў значэнне сваёй адукацыі.

**3 група – вобраз Саханюка.**

Саханюк – хатовіцкі настаўнік, які не ўлягае ў работу. Саханюк не вельмі далёка рушыў наперад са сваімі вучнямі. Яму не цікавяць поспехі вучняў. *"Э, плюньце вы на гэта..."*. Ён бярэ плату салам за тое, каб напісаць ліст сыну ці мужу ў войска, ці скласці прашэнне. Учынак з сялянскай ссыпкай шмат гаворыць пра Саханюка. Галоўнае для яго – матэрыяльны дабрабыт.

**Слова настаўніка.**

Раскрываючы духоўны свет герояў, вы ўбачылі, што пакаленне пачатку дваццатага стагоддзя моцна адрознівалася ад сучаснай моладзі. Адкажыце на ключавое пытанне ўрока: "Што зближае вас з героямі трылогіі?"

**IV. Кантрольна-карэкцыйны этап.**

**Аналітычная гутарка.**

1. Якой павінна быць інтэлігенцыя?
2. Які з настаўнікаў вам найбольш спадабаўся?
3. З якімі настаўнікамі яшчэ сустракаліся ў творы?
4. Якія рысы характару найперш павінны быць у настаўніка?
5. Ці варта звяртаць увагу на знешні выгляд настаўніка?

**V. Рэфлексіўна-ацэначны этап.**

**Дапоўні сказы.** У вуснай форме паразважайце, выкарыстоўваючы прыведзеныя схемы:

Калі б ..., то ...
Усе настаўнікі ..., але мала хто ...
Той, хто..., заўсёды...
Калі вы ..., то ...
Самае .... гэта не..., а...
Настаўнік – чалавек, які ...
Гэта азначае, што...важней за ...
Не важна, як часта вы..., важна, як часта вы...
Самы лёгкі характар у, самы невыносны характар...
Вам не здаецца гэта дзіўным, бо ... .

**Слова настаўніка.**

З цягам часу сістэма каштоўнасцей мяняецца. Аднак кожнаму хочацца кахаць і быць каханым, мець сям'ю, сяброў. Застаюцца вечныя каштоўнасці – любоў да радзімы, сяброўства, каханне, сям'я.

**Выстаўленне адзнак за ўрок.**

**V. Дыферэнцырыванае дамашняе заданне:**

1) складзіце сінквейн на тэму: "Настаўнік XXI стагоддзя"

або

2) напішыце эсэ "Маё пытанне Лабановічу, Турсевічу або Саханюку".

*Дата поступления в редакцию: 02.04.2023*

# ПЛАН-КОНСПЕКТ УРОКА ПО УЧЕБНОМУ ПРЕДМЕТУ «ИНОСТРАННЫЙ ЯЗЫК (АНГЛИЙСКИЙ)» В V КЛАССЕ ПО ТЕМЕ «ПРОДУКТЫ ПИТАНИЯ»

*Атрахимович Иван Иосифович*

**Учебная цель:** планируется, что к окончанию урока учащиеся смогут вести беседу о продуктах питания и приемах пищи в Великобритании и Республике Беларусь, используя изученный на учебном занятии лексико-грамматический материал

**Учащиеся будут уметь:** вести беседу о продуктах питания, приёмах пищи в Беларуси и Великобритании; анализировать и сравнивать продукты питания в разных странах, использовать неопределенные местоимения some, any в устной и письменной речи, а также использовать оборот There is / There are.

**Задачи:** совершенствовать языковую и речевую компетенции учащихся для осуществления говорения по теме учебного занятия; способствовать развитию умений использовать в устной речи информацию, полученную при чтении текстов и восприятии иноязычной речи на слух; создать условия для развития у учащихся умений работать с различными источниками информации, анализировать, устанавливать причинно-следственные связи; воспитывать культуру питания как составляющую здорового образа жизни; воспитывать уважение к традициям национальной кухни Беларуси и Великобритании как части мировой культуры.

**Тип урока:** комбинированный урок.

**Форма организации учебной деятельности:** индивидуальная, парная, групповая работа, фронтальная работа, прием «шестеренка».

**Планируемый результат:** составление интеллект-карты по теме «Продукты питания».

**Оборудование:** интерактивная доска, доска, видеоматериалы, компьютерная презентация, раздаточный дидактический материал[1].

**Ход урока**

**I. Ориентировочно-мотивационный этап. (7 мин.)**

*Деятельность учителя: приветствует учащихся, создает эмоциональную ситуацию для привлечения внимания учащихся, мотивирует учащихся на активную познавательную деятельность на уроке, помогает сформулировать цели и задачи урока, проверяет уровень подготовленности учащихся.*

*Деятельность учащихся: эмоционально настраиваются на изучение темы, формулируют задачи урока, определяют (оценивают) уровень своих знаний для изучения новой темы.*

*Использованные методы: анкетирование, наглядно-иллюстративный метод.*

Good morning, dear girls and boys! I'm glad to see you. Sit down, please. How are you?

Ask your classmates what they ate for breakfast today (слайд 2). *(Учащиеся: Задают вопросы одноклассникам. What did you have for breakfast today?).*

[1] Лапицкая, Л.М. Английский язык: учеб. пособие для 5-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения: с электронным приложением. В 2 ч. Ч. 2 / Л.М. Лапицкая [и др.]. – Минск: Вышэйшая школа, 2020 – 135 с.: ил. + электрон. прил.
2. Evans, V. Round-Up 2. New and Updated / V. Evans // Longman, Pearson Education Limited, 2005. – 145 p.
3. MindMeister [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://mindmeister.com. – Дата доступа: 01.12.2022.
4. This is Britain Food [Электронный ресурс]: Long Nguyen. – Режим доступа: https://youtu.be/aKbIilKwJwg. – Дата доступа: 07.12.2022.